Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад рэктара БДУ
26.04.2023 № 259-ОД

ПАЛАЖЭННЕ
аб савеце факультэта сацыякультурных камунікацый

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Савет факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ (далей – савет) з'яўляецца пастаянна дзеючым выбарным органам самакіравання факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ (далей – факультэт).

2. Савет у сваёй дзейнасці кіруецца палажэннямі дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Статутам БДУ, Палажэннем аб факультэце і дадзеным Палажэннем.

3. Выбарны характар савета забяспечваецца фарміраваннем болей 50% ад яго складу шляхам выбараў прадстаўнікамі акадэмічнай супольнасці факультэта, грамадскімі арганізацыямі. Парадак фарміравання савета вызначаецца дадзеным Палажэннем.

4. Старшынёй савета з'яўляецца дэкан факультэта, які ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва яго дзейнасцю.

Старшыня савета мае намесніка, які вызначаецца старшынёй з ліку членаў савета.

5. Бягучую дзейнасць савета забяспечвае вучоны сакратар (далей – сакратар), які абіраецца саветам са свайго складу адкрытым галасаваннем.

6. Тэрмін паўнамоцтваў савета – тры гады.

## ГЛАВА 2
## СКЛАД І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ САВЕТА

7. Склад савета зацвярджаецца распараджэннем дэкана факультэта ў колькасці да 32 чалавек.

8. У колькасны склад факультэта ўваходзяць:

па пасадзе: дэкан факультэта, намеснікі дэкана факультэта;

асобы, абраныя адкрытым або таемным галасаваннем на пасяджэннях кафедр, грамадскіх, прафсаюзных, маладзёжных арганізацый, сходах працоўных калектываў.

8.1. Нормы прадстаўніцтва супрацоўнікаў факультэта:

ад кафедр – па адным прадстаўніку;

ад выпускаючых кафедр з колькасцю штатных адзінак прафесарска-выкладчыцкага складу больш за 10 – дадаткова па адным прадстаўніку;

ад прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў факультэта, савета маладых навукоўцаў факультэта, вучэбна-метадычнай камісіі факультэта – па адным прадстаўніку.

8.2. Нормы прадстаўніцтва асоб, якія навучаюцца на факультэце:

ад студэнцкага савета факультэта, пярвічнай арганізацыі ГА "БРСМ" БДУ факультэта, прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў факультэта – па два прадстаўнікі;

ад студэнцкага савета па якасці адукацыі і навукі факультэта, савета стараст факультэта – па адным прадстаўніку.

9. Па рашэнні дэкана факультэта ў савет могуць быць уключаны таксама загадчыкі кафедр, асобы, якія навучаюцца на факультэце, прадстаўнікі арганізацый – заказчыкаў кадраў, прафсаюзных арганізацый, студэнцкага савета, маладзёжных аб'яднанняў, зямляцтваў замежных асоб, якія навучаюцца, іншыя асобы.

У выпадку звальнення і (або) адлічэння члена савета з БДУ ён аўтаматычна выбывае з яго складу.

10. Па прапанове рэктара БДУ або членаў савета можа быць прынята рашэнне аб датэрміновых выбарах савета, калі за такое рашэнне прагаласавала болей паловы складу членаў савета.

11. Член савета можа быць выведзены з яго складу па рашэнні кваліфікаванай большасці ў 2/3 ад складу савета. З ініцыятывай такога рашэння можа выступіць дэкан факультэта альбо не менш як 10 членаў савета.

12. У выпадку выбыцця або вываду са складу савета члена савета, па рашэнні дэкана факультэта праводзіцца давыбранне або назначэнне членаў савета, пры гэтым паўнамоцтвы новага члена савета пачынаюцца з моманту падпісання адпаведнага распараджэння дэкана і абмежаваны межамі ўстаноўленага тэрміну паўнамоцтваў савета.

## ГЛАВА 3
## ПАЎНАМОЦТВЫ І ФУНКЦЫІ САВЕТА

13. Савет факультэта:

вырашае найважнейшыя пытанні развіцця факультэта, арганізацыі адукацыйнага працэсу, ідэалагічнай і выхаваўчай работы, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, міжнароднага супрацоўніцтва, рэалізацыі Палітыкі БДУ ў галіне якасці, аховы працы;

разглядае і рэкамендуе да зацвярджэння (ва ўстаноўленых выпадках – зацвярджае) планы работы факультэта, планы вучэбнай, навукова-метадычнай, навукова-даследчай, ідэалагічнай і выхаваўчай работы, што выконваецца на факультэце, планы правядзення навуковых мерапрыемстваў, планы падрыхтоўкі выданняў и справаздачы аб іх выкананні;

прапануе пералік адукацыйных праграм, спецыяльнасцей і прафілізацый, па якіх вядзецца навучанне на факультэце;

распрацоўвае стратэгію развіцця факультэта, зацвярджае мэты ў галіне якасці;

праводзіць аналіз выканання мэтавых паказчыкаў, маніторынг асноўных і забяспечваючых працэсаў факультэта, разглядае карэкціруючыя і папераджальныя дзеянні, зацвярджае адпаведныя планы і справаздачы;

рэкамендуе да зацвярджэння распрацаваныя кафедрамі вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах, праграмы практык, вучэбныя праграмы дзяржаўных экзаменаў;

уносіць прапановы па стварэнні, рэарганізацыі або ліквідацыі кафедр, іншых структурных падраздзяленняў факультэта, вызначае асноўныя напрамкі іх дзейнасці;

абірае ва ўстаноўленым парадку прадстаўнікоў у склад Савета БДУ і іншых выбарных органаў БДУ;

вылучае кандыдатаў на пасаду дэкана факультэта;

заслухоўвае справаздачы дэкана, намеснікаў дэкана, загадчыкаў кафедр аб арганізацыйнай, вучэбнай, навукова-метадычнай, навукова-даследчай, ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце, павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы работнікаў факультэта;

распрацоўвае і прымае рашэнні, накіраваныя на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі з улікам патрабаванняў сучасных ведаў, укараненне ў практыку перадавых метадаў навучання;

рэкамендуе кандыдатаў на абранне ў склад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

прапануе для вылучэння Савету БДУ работы на суісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, праводзіць папярэдні адбор і абмеркаванне кандыдатаў у суіскальнікі гэтай прэміі;

ва ўстаноўленым парадку ўносіць прапановы аб узнагароджанні дзяржаўнымі, урадавымі ўзнагародамі і ўзнагародамі Парламента Рэспублікі Беларусь, прапановы аб прысваенні ганаровых званняў;

вылучае кандыдатаў на назначэнне пенсіі за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь;

устанаўлівае ўзнагароды факультэта і прымае рашэнні аб узнагароджанні імі;

зацвярджае сімволіку факультэта;

уносіць прапановы па парадку прыёму (залічэння) у БДУ;

уносіць прапановы аб прысваенні вучоных званняў у адпаведнасці з парадкам, вызначаным заканадаўствам;

рэкамендуе для паступлення ў магістратуру, аспірантуру і дактарантуру;

зацвярджае тэмы кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, навуковых кіраўнікоў (кансультантаў) і індывідуальныя планы падрыхтоўкі аспірантаў, дактарантаў і суіскальнікаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

ацэньвае эфектыўнасць падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі;

прымае рашэнні аб мэтазгоднасці ўдзелу ў конкурсах на выкананне навукова-даследчых работ, доследна-канструктарскіх і тэхналагічных работ (далей – НДДК(Т)Р), мэтазгоднасці выканання НДДК(Т)Р, навуковым кіраўніцтве і адказным выкананні, зацвярджэнні планаў і справаздач па НДДК(Т)Р, аб стварэнні і дзейнасці часовых навуковых калектываў;

забяспечвае ўстанаўленне, падтрыманне і развіццё сувязей з арганізацыямі-заказчыкамі кадраў;

праводзіць аналіз задаволенасці спажыўцоў адукацыйных паслуг, якія аказвае факультэт;

рэкамендуе да публікацыі выданні і працы, падрыхтаваныя супрацоўнікамі і (або) студэнтамі, аспірантамі, дактарантамі, суіскальнікамі факультэта;

вырашае іншыя пытанні, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Статутам БДУ, іншымі лакальнымі прававымі актамі БДУ.

## ГЛАВА 4
## ПАРАДАК РАБОТЫ САВЕТА

14. Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць на пасяджэннях, якія праводзяцца не радзей за шэсць разоў на год.

Пытанні для разгляду на пасяджэнні савета ўносяцца ў адпаведнасці з планам работы савета на навучальны год, які зацвярджаецца старшынёй савета (намеснікам старшыні савета).

Пасяджэнні савета склікаюцца па рашэнні дэкана факультэта, які вызначае дату правядзення пасяджэння, праект парадку дня і дакладчыкаў.

15. Пытанні, якія выносяцца на разгляд савета, падрыхтоўваюцца ў выглядзе праектаў рашэнняў. Праект рашэння (пры неабходнасці – таксама суправаджальныя матэрыялы) накіроўваецца не пазней за тры дні да даты пасяджэння сакратару савета.

Сакратар савета не пазней, чым за тры дні да пасяджэння даводзіць да членаў савета праект парадку дня і матэрыялы да пасяджэння.

16. Пасяджэнні Савета лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш як 2/3 яго складу.

Пасяджэнні савета вядзе старшыня савета або намеснік старшыні савета. Пасяджэнні савета, у якіх не ўдзельнічаў старшыня савета і (або) яго намеснік лічацца неправамоцнымі.

У выпадку немагчымасці ўдзелу ў пасяджэнні сакратара савета, яго функцыі ў рамках канкрэтнага пасяджэння па рашэнні савета ўскладаюцца на аднаго з членаў савета.

17. Пасяджэнні могуць праводзіцца вочна (у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій), завочна (метадам апытання).

18. Рашэнні савета прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў. Пры роўнай колькасці галасоў вырашальным з’яўляецца голас старшыні савета (у выпадку яго адсутнасці – намесніка старшыні савета).

Парадак галасавання вызначаецца саветам і можа быць вочным, з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, завочным.

Рашэнні па кадравых пытаннях прымаюцца саветам у адпаведнасці з лакальнымі прававымі актамі, як правіла, тайным галасаваннем з выкарыстаннем бюлетэняў.

Тайнае галасаванне можа быць праведзена і па іншых пытаннях, калі такое рашэнне будзе прапанавана старшынёй на пасяджэнні і за яго прагаласуе большасць членаў савета, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні.

## ГЛАВА 5
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

19. У выпадку неабходнасці па рашэнні савета з ліку членаў савета могуць фарміравацца камісіі (у тым ліку – камісія па этыцы савета) і рабочыя групы савета, парадак функцыянавання якіх вызначаецца саветам.

20. Члены савета абавязаны выконваць патрабаванні дадзенага Палажэння, Этычнага кодэкса БДУ, садзейнічаць рэалізацыі функцый савета, у тым ліку інфармаваць членаў калектыву аб рашэннях савета.

21. Пасяджэнні савета падлягаюць абавязковаму пратакаліраванню. Як правіла, вядзецца пратакол поўнай формы.

Рашэнні, прынятыя саветам, афармляюцца пратаколам і ўступаюць у сілу з моманту падпісання старшынёй (намеснікам старшыні, які вёў пасяджэнне ў адсутнасць старшыні) і сакратаром савета.

22. У выпадку нязгоды дэкана з рашэннем савета спрэчныя пытанні выносяцца на паўторны разгляд і лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала не менш як дзве трэці складу савета. Паўторны разгляд праходзіць на наступным пасяджэнні савета.

23. Рашэнні савета абавязковыя для структурных падраздзяленняў, членаў калектыву факультэта.

24 Сакратар савета ажыццяўляе маніторынг выканання рашэнняў савета, аб выніках якога інфармуе савет не радзей як адзін раз на год.

Дэкан факультэта
сацыякультурных камунікацый А.В.Бурачонок